УДК 373.3.016.004.9

# ДЫЯГНОСТЫКА СФАРМІРАВАНАСЦІ НАВЫКУ БЕГЛАГА ЧЫТАННЯ Ў ВУЧНЯЎ 3 КЛАСА

***А. В. Ігнаценка*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***Л. І. Шапавалава***,
канд. філал. навук, дацэнт

Бегласць чытання – самы высокі тэмп чытання, пры якім вучні разумеюць прачытанае – з'яўляецца адной з якасцей навыку чытання ў цэлым. Для ўдасканалення бегласці чытання вучняў 3 класа ДУА "Стараруднянскі дзіцячы сад–сярэдняя школа Жлобінскага раёна" нам неабходна было выявіць узровень сфарміраванасці ў іх навыку беглага чытання.

Першапачаткова быў ажыццёўлены падбор дыягнастычнага матэрыялу і вызначэнне на яго аснове ўзроўню бегласці чытання вучняў.

Спачатку вучням было прапанавана адказаць на 10 пытанняў. Адны з іх дапамаглі выявіць асэнсаванасць чытання (*Ці заўсёды разумееце сэнс прачытанага?*); другія паказалі наяўнасць ці адсутнасць фактараў, якія тармазяць чытанне (*Вяртаецеся вы позіркам да ўжо прачытанага тэксту?*); трэція ўдакладнялі спосаб чытання (*Як рухаюцца вашы вочы пры чытанні?*). Пасля выканання заданняў была падлічана агульная сума балаў кожнага вучня. Зона добрых адказаў размяшчаецца ў дыяпазоне ад 80 да 100 балаў, здавальняючых – ад 60 да 80; вынікі, меншыя за 60 балаў, расцэньваюцца як нездавальняючыя, бо не адпавядаюць нарматыўным хуткасным параметрам чытання. Акрамя таго, дзякуючы гэтаму апытальніку былі выяўлены прычыны нездавальняючага па хуткасці чытання: нізкая засяроджанасць увагі, вяртанне погляду да прачытанага тэксту, суправаджэнне чытання дадатковымі рухамі (галавой, рукой, пальцам), адсутнасць вобразных уяўленняў.

Наступным этапам дыягностыкі бегласці чытання стаў замер колькасці прачытаных за хвіліну слоў. Тэкстам для вымярэння быў абраны "Выпадак з марожаным" (паводле М. Лук). Пасля чытання тэксту вучням было прапанавана адказаць на 5 пытанняў для кантролю ўсвядомленасці прачытанага. Вынікі былі падобныя да вынікаў папярэдняй дыягностыкі.

Для ўдакладнення атрыманых вынікаў была праведзена гутарка з класным кіраўніком, які даў дадатковую інфармацыю аб кожным вучню.

Прааналізаваўшы ўсе атрыманыя дадзеныя, мы вылучылі агульныя асаблівасці чытання вучняў з нізкім, сярэднім і высокім узроўнямі развіцця бегласці чытання і акрэслілі віды практыкаванняў для яе далейшага ўдасканалення.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова